*Заснавальнік*

АДМІНІСТРАЦЫЯ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ




Выходзіць з кастрычніка 1991 г.

**7**
ліпень
2007

ШТОМЕСЯЧНЫ НАВУКОВА-ТЭАРЭТЫЧНЫ
І ГРАМАДСКА-ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ ЧАСОПІС

## У НУМАРЫ:


| | | |
|---|---|---|
| *ПАЛІТЫКА* | **Черняк А.** Беларусь для России самый верный друг | 3 |
| | **Ядренцев И.** Дом в кредит | 8 |
| *УЛАДА* | **Вялічка У., Марціновіч А.** Людзям прывольна, птушкам вольна | 15 |
| *МОМАНТ ІСЦІНЫ* | **Шелехов М.** Рынок — имя существительное | 29 |
| *АСОБА* | **Шырко В.** Атолінскія промні | 38 |
| *ФІЛАСОФІЯ І СУЧАСНАСЦЬ* | **Стёпин В.** Мудрость и музыка | 47 |
| *ЭКАНОМІКА* | **Пузиков В.** Свобода для маневра | 55 |
| | **Сорвиров П.** Переход к пройденному | 61 |
| | **Ракевич Н.** А у нас — биогаз | 65 |
| *ЭЎРЫКА!* | По страницам зарубежных журналов | 69 |
| *НАВУКА І ТЭХНАЛОГІІ* | **Захаренко И.** Геоинформационная безопасность страны | 75 |
| | **Коршак М.** Разносторонний талант | 83 |
| *АДУКАЦЫЯ І ВЫХАВАННЕ* | **Зданович В.** Как наши знанья отзовутся? | 85 |
| | **Вячорка Г.** Мэты і прыярытэты | 92 |
| | **Опрышко Е.** А дети мечтают о доме... | 98 |
| *ДУХОЎНАСЦЬ* | **Сауліч У.** Райскі куточак Ёзаса Булькі | 100 |
| *ПРАВА* | **Савич О.** Этика защиты | 106 |
| | **Хилюта В.** Наследники трапезитов | 111 |
| *СОЦЫУМ: РАКУРСЫ І ГРАНІ* | **Жеребцов С.** Золотая осень | 117 |
| | **Зборовский Э.** Целительная сила морали | 125 |
| *ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ* | **Скеп'ян Н.** Інстытут канцлерства і Беларусь | 129 |
| *ПЛАНЕТА І МЫ* | **Шимов В.** Возможно ли государство-нация на постсоветском пространстве? | 135 |
| *КУЛЬТУРА І ЖЫЦЦЁ* | **Ярмалінская В.** Малады тэатр на Палессі | 143 |
| | **Грибайло В.** Возрожденный «Нестерка» | 150 |
| *КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ* | **Мушынскі М.** Максім Лужанін — найбліжэйшы з акружэння песняра | 157 |
| | **Фрольцова Н.** Солдат белорусского искусства | 165 |

| | | |
|---|---|---|
| | **Сабіна П.** Бортнікі | 170 |
| *ЭКАЛОГІЯ* | **Лярский П.** Чтоб земля стала оазисом | 176 |
| *СПОРТ І ЗДАРОЎЕ* | **Лісоўскі С.** Вясковыя волаты | 182 |
| | **Викентьев Н.** Лечить детей — ее счастье | 187 |
| | **Сяленя Я.** Пра пілу, сякеру і людскія лёсы | 190 |
| | **Кузьменков О.** Тренажер по имени Лада | 191 |
| *ПОШТА* | **Михайлик Г.** Агротуризм как статья дохода | 192 |

Галоўны рэдактар У. П. ВЯЛІЧКА

*Рэдакцыйная калегія:*

А. М. Андрэеў, У. П. Андрэйчанка, С. П. Вінакурава, Л. Я. Землякоў, А. А. Каваленя, Ч. С. Кірвель, С. Н. Князеў, А. А. Марціновіч, Г. А. Махнач, М. У. Мясніковіч, А. В. Праляскоўскі, С. В. Рашэтнікаў, У. В. Русакевіч, М. С. Сташкевіч, І. А. Чарота, У. М. Шымаў, В. А. Шырко, М. М. Шэлехаў, Л. М. Якавенка

*Тэлефоны рэдакцыі:*

галоўнага рэдактара — 292-13-24; першага намесніка галоўнага рэдактара — 292-13-36; намесніка галоўнага рэдактара — 287-16-54; прыёмнай — 292-12-94;

*аддзелаў:* філасофіі, гісторыі і міжнароднага жыцця — 287-16-54; дзяржаўнага будаўніцтва — 287-18-91; эканомікі — 287-19-88; навукі і тэхналогій — 287-18-91; экалогіі і медыцыны — 287-15-82; сацыяльных праблем і права — 287-15-82; адукацыі і маралі — 287-19-88; літаратуры і мастацтва — 292-13-36; мастацкага афармлення — 287-18-91; карэктарскай — 287-17-65; бухгалтэрыі — 287-17-88; факс — 287-17-88. *E-mail:beldumka@telecom.by.*

Часопіс выходзіць на беларускай і рускай мовах у залежнасці ад мовы аўтарскага арыгінала. Аўтары апублікаваных матэрыялаў у адпаведнасці з Законам аб друку нясуць адказнасць за дакладнасць прыведзеных фактаў і звестак. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Перадрукоўванне дазваляецца па ўзгадненню з рэдакцыяй, спасылка на часопіс «Беларуская думка» абавязковая.

Мастацкі рэдактар Н. Ф. Овад
Тэхнічны рэдактар Н. Я. Гарбар
Карэктары: Р. І. Акшэўская, Т. Ф. Архіпенка, Л. П. Жыткавец

Падпісана да друку 25.06.2007
Фармат 70x108$^1/_{16}$. Афсетны друк. Гарнітура Таймс. Папера афсетная
Умоўна-друк. арк. 16,8. Умоўн. фарбаадб. 17,2. Ул.-выд. арк. 20
Тыраж 6234 экз. Заказ 1457. Цана ў розніцу — 2500 руб.

*Адрас рэдакцыі:* 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79.

© «Беларуская думка», 2007

**Георгій ВЯЧОРКА**

Загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, дацэнт Палескага дзяржаўнага універсітэта, кандыдат педагагічных навук

# Мэты і прыярытэты

**Сучаснае беларускае грамадства з'яўляецца пераходным да якасна новага стану ўсіх сфер жыцця: сацыяльнага, палітычнага, эканамічнага, культурнага і духоўнага. І гэты пераход, або развіццё грамадства, як падкрэслівае Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, павінен адбывацца эвалюцыйна і перш за ўсё ў рэчышчы ўласных культурных традыцый: *«К заимствованию идеалов, ценностей и целей необходимо подходить осторожно» [1].***

**Такая ўстаноўка ёсць не што іншае, як праяўленне на высокім дзяржаўным узроўні менталітэту беларускага народа, яго нацыянальнага характару — разважлівасці, няспешнасці, і гэтак далей. *«Мы создаем государство,*— гаворыць Прэзідэнт,— *в котором на деле реализуется принцип народовластия, воплощаются общечеловеческие идеалы и нравственные ориентиры, обеспечивается преемственность национальных традиций, сохранены и приумножаются фундаментальные ценности духовной веры, семьи, коллектива»*** *[Тамсама].*

**Разам з тым, у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь гаворыцца, што «дзяржава адказная перад грамадзянінам за стварэнне ўмоў для свабоднага і годнага развіцця асобы»** *[2. С. 5].* **Таму вельмі важна ўдасканаліць накірункі выхавання нашай моладзі, каб гарманічна спалучаліся грамадскія патрабаванні і ўласныя патрэбы, індывідуальныя і сацыяльныя каштоўнасці.**

## Рэтраспектыва

Для філасофіі адукацыі і навуковай педагогікі акрэсленае вышэй пытанне — гэта праблема, як найлепшым чынам трансфармаваць прыярытэты нашага грамадства ў педагагічныя катэгорыі ідэалаў, мэт і задач. Як адзначаецца ў сучаснай аксіялогіі, **агульначалавечыя каштоўнасці з'яўляюцца сэнсаўтваральнымі асновамі чалавечага жыцця, задаюць яго накіраванасць і матываванасць, вызначаюць маральныя асновы і характар паводзін людзей** *[3. С. 25].*

Раздзяляючы паняцці каштоўнасцей і мэт, філосафы адукацыі пішуць: «Ценность как переживаемое отношение и цель как предвосхищенный результат деятельности могут замыкаться на одних и тех же объектах, но располагаются в различных плоскостях рассмотрения» *[4. С. 139].* Мэты грамадскага выхавання, як і тыя, што ставіць перад сабой чалавек у дачыненні да каштоўнасцей асобы, падпарадкоўваюцца прыярытэтам, у дадзеным выпадку — сацыяльным, бо кожнае грамадства зацікаўлена ў тым, каб людзі прытрымліваліся пазітыўных прынцыпаў жыцця. Калі каштоўнасці захопліваюць асобу цалкам, уключаючы і несвядомую яе частку, то мэтам больш уласцівы свядомасны характар.

Калі гаварыць пра ідэал, ён уяўляе сабой нейкі канструкт вельмі жаданых мэт, верагоднасць здзяйснення якіх невялікая. Разам з тым: «Ідэалам можна назваць толькі тое, што мае ў сабе рэальныя тэндэнцыі, перспектывы для ўвасаблення ў рэчаіснасці» *[5. С. 11]*. Інакш кажучы, гэта пуцяводная зорка або суперстратэгічны арыенцір паводзін і дзейнасці. У структуры педагагічнага мэтамеркавання ідэалы могуць быць канкрэтызаваны спачатку ў мэтах, а затым у задачах выхавання. І, наадварот, апошнія могуць быць генералізаваны ў ідэалы.

Мэты выхавання, як і адпаведныя ім каштоўнасці, дастаткова рухомыя, зменлівыя, маюць канкрэтна-гістарычны характар. Пры гэтым у грамадствах, што маюць розныя сацыяльныя слаі, класы, канфесіі, партыі, нават у адзін і той жа гістарычны перыяд могуць суіснаваць розныя мэты.

Так, у Старажытнай Грэцыі з юнакоў фарміравалі моцных, храбрых і дысцыплінаваных воінаў, законапаслухмяных грамадзян, верных сваёй дзяржаве. У дзяўчынках жа бачылі перш за ўсё фізічна здаровую будучую маці, умелую і эканомную хатнюю гаспадыню. Афінскія педагогі спалучалі разумовае, маральнае і фізічнае выхаванне. Але гэта не распаўсюджвалася на рабоў, якіх рыхтавалі да абслугоўвання спадароў у паслухмянасці ды пакорлівасці. Для Сярэднявечча характэрна адрозненне ўмоў, у якіх выхоўвалі рыцараў, рамеснікаў і сялян. Прадстаўнік эпохі Адраджэння, заснавальнік навуковай педагогікі Я. А. Каменскі лічыў галоўным пазнанне сябе і навакольнага свету (разумовае выхаванне), кіраванне сабой (маральнае выхаванне), імкненне да Бога (рэлігійнае выхаванне).

У Новы час французскія філосафы-асветнікі К. Гельвецый, Ж. Ж. Русо і іншыя мэту выхавання звязвалі з памкненнямі на карысць грамадства, з агульначалавечымі каштоўнасцямі. Некаторыя мысліцелі і педагогі-гуманісты — з усебаковым і гарманічным развіццём асобы. Так, швейцарскі педагог-дэмакрат І. Песталоцці сцвярджаў, што выхаванне павінна развіваць здольнасці і дараванні чалавека, закладзеныя ў яго прыродай, пастаянна іх удасканальваць для забеспячэння «гарманічнага развіцця сіл і здольнасцей чалавека». Нямецкі педагог І. Гербарт сцвярджаў, што асноўнае — развіццё чалавека, які ўмее прыстасоўвацца да рэчаіснасці. Вялікай гуманістычнай сілы ідэя ўсебаковага і гарманічнага развіцця асобы, якая ўзнікла яшчэ ў Антычнасці і па-рознаму праяўляла сябе ў многіх сістэмах, цалкам была выкарыстана філасофіяй марксізму. Менавіта гэтая ідэя ў розных варыяцыях стала асновай усіх камуністычных адукацыйна-выхаваўчых праграм.

Звяртаючыся да досведу іншых краін і народаў, важна звярнуць увагу на адрозненне структур мэтамеркавання ў розных грамадствах. У дэмакратычных, як правіла, назіраецца разнастайнасць мэт выхавання, аж да немагчымасці выдзялення галоўных. Таму яны дэкларуюцца агульна і абстрактна: «выхаванне здольных і карысных членаў грамадства, дастаўляючых яму гонар сваімі справамі», «прыстасаванне да нормаў, сталых стандартаў і вечных ісцін», «развіццё і рост асобы», «псіхалагічная сталасць асобы», «прыстасаванне да жыцця» і гэтак далей. Што тычыцца ЗША, як найбольш актыўнага генератара і абаронцы ліберальна-дэмакратычных каштоўнасцей, то паводле ўзніклай там філасофска-педагагічнай канцэпцыі прагматызму патрабаванні да маладых людзей на федэральным узроўні зводзяцца да таго, каб яны былі канкурэнтаздольнымі і эфектыўнымі вытворцамі, адказнымі грамадзянамі, разумнымі спажыўцамі і добрымі сем'янінамі.

У таталітарных грамадствах у выніку іх монаідэалагічнай сутнасці, як правіла, афіцыйна ўстанаўліваецца адзіная для ўсіх грамадзян мэта выхавання. Добры прыклад тут — СССР, з яго аднапартыйнай сістэмай і непадзельным панаваннем камуністычнай ідэалогіі, якая абвясціла ўсебаковае і гарманічнае развіццё асобы, падпарадкаванае ідэалам камунізму. Ажыццяўлялася гэтая ідэя праз так званую адзіную, працоўную, політэхнічную школу і маральны кодэкс будаўніка камунізму.

Пасля вядомых падзей 1991 г. большасць беларускіх педагогаў-навукоўцаў адмовілася ад усебаковага і гарманічнага развіцця асобы як мэты выхавання. Гэта матывавалася неканкрэтнасцю, нетэхналагічнасцю, утапічнасцю і нават выключнай прыналежнасцю гэтай мэты толькі камуністычнаму грамадству. У той жа час многія вядомыя навукоўцы ў галіне педагогікі (Ю. П. Азараў, Б. Т. Ліхачоў, У. П. Підкасісты, І. П. Падласы, В. С. Селіванаў, І. Ф. Харламаў, Я. М. Шыянаў і іншыя) адстойвалі і працягваюць адстойваць яе гуманістычны патэнцыял у процівагу голаму практыцызму, які прыгнятае паўнацэннае фарміраванне чалавека.

## Шукаем «залатую сярэдзіну»

Кіруючыся старажытнакітайскім правілам «залатой сярэдзіны», адважымся сфармуляваць наша мэтамеркаванне наступным чынам. Усебаковае і гарманічнае развіццё асобы трэба было б лічыць ідэалам выхавання, які ў залежнасці ад напрамкаў і ўзроўняў адукацыі, кантынгента выхаванцаў і тыпу адукацыйна-выхаваўчых устаноў, рэгіянальных і рэлігійна-этнічных умоў увасабляецца ў канкрэтных мэтах. Гэта па-першае.

Па-другое, **неабходна пераасэнсаваць само паняцце ўсебаковага і гарманічнага развіцця асобы.** Трэба вярнуцца да спрадвечнага значэння **цэласнага развіцця** ўсіх здольнасцей, закладзеных у чалавека прыродай. А **пад гарманічнасцю развіцця** сёння важна разумець не столькі суадносіны разумовых, фізічных, маральных і другіх якасцей асобы, колькі спалучэнне асабістых патрэб і грамадскіх патрабаванняў, індывідуальных і сацыяльных каштоўнасцей. Таму што ў савецкія часы на раўнацэнныя суадносіны асабістага і грамадскага асабліва не звярталі ўвагі. Новае разуменне гарманічнасці мае сапраўды гуманістычны характар, павышаючы ролю самаактуалізацыі, самаўдасканалення або самавыхавання моладзі ў адпаведнасці з чаканнямі грамадства.

Менавіта ў такім сэнсе ідэя ўсебаковага і гарманічнага развіцця асобы можа быць узята ў якасці ідэалу выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў нашай краіне. Тым самым у пэўнай меры пераадольваецца разрыў паміж неабходнасцю захавання традыцый і пошуку інавацый. Як адзначаў адзін з заснавальнікаў філасофскай герменеўтыкі Г. Г. Гадамер, сапраўднае стаўленне да традыцыі гэта не адмаўленне і не апалагетыка, а «дыстанцыяванне». Тое самае можна сказаць і пра інавацыі, якія не павінны без аглядкі як прымацца, так і адхіляцца. Напрыклад, рынкавыя каштоўнасці, што прапануюцца ў нас у якасці сацыяльна-педагагічных арыенціраў (канкурэнтаздольнасць, поспех, прадпрымальнасць і г. д.), вядома ж, могуць быць трансфармаваны ў педагагічныя мэты, але даволі памяркоўна і асцярожна. Доктар культуралогіі, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута параўнальнай паліталогіі РАН А. П. Давыдаў папярэджвае: «Рыночные критерии нравственности в России не завоевали ключевых позиций в массовом сознании даже в начале XXI века. Они и сегодня в основном освистываются и предаются анафеме... Чем выше честная прибыль, тем нравственнее — это дико и невероятно слышать русскому уху и сегодня, и ограничение “честная” не спасает, потому что высокая прибыль в русском сознании не может быть честной по определению» *[6. С. 272]*. Зразумела, рускі менталітэт ад беларускага адрозніваецца, асабліва ў нашых заходніх землях. І тым не менш. Як падкрэслівае Прэзідэнт Беларусі: «Ярко выраженный индивидуализм, бездуховность, готовность жить в постоянной гонке за наживой — все это глубоко чуждо русским, восточнославянскому менталитету в целом» *[1]*.

Не менш важная праблема педагагічнага мэтамеркавання — суадносіны арыентацый на агульначалавечыя і нацыянальныя каштоўнасці. «Сложность проблемы,— піша акадэмік Б. С. Гершунскі,— заключается в том, чтобы в поисках инвариантов формируемых личностно и общественно значимых качеств лич-

ности и их общечеловеческих эквивалентов не подавлять специфику ментальных характеристик, обусловленных национально-этническими, культурно-историческими, религиозно-философскими различиями соответствующих человеческих общностей. В противном случае в сферу образования может быть внесена органически противопоказанная ей односторонняя унитарность, своего рода "образовательный шовинизм", неизбежно реанимирующий единообразие образовательных учреждений и ведущий, в конечном итоге, к авторитарным методам управления образованием. Столь же опасен и "образовательный национализм", когда в угоду ложно понимаемому патриотизму неумеренно "выпячиваются" сугубо национальные ценности и приоритеты в надежде на их уникальную самодостаточность. Разумная гармония дифференциации и интеграции целей образования, как и во многих других случаях,— единственно надежный путь поисков новых философских доктрин образовательной деятельности» *[7. С. 142]*.

У гэтым сэнсе беларускае грамадства знаходзіцца ў стане дысгармоніі. Ва ўмовах шматвяковага дамінавання польскіх, а больш рускіх, культурных каштоўнасцей, нацыянальная культура не магла паслядоўна і гарманічна развівацца. Спадчына такіх культурна-гістарычных дэфармацый праяўляецца і сёння. Што асабліва бачна на прыкладзе выкарыстання мовы карэннага этнасу. А менавіта,— беларускай, як у дзяржаўных справах, так і ў прыватным жыцці. Таму для далейшай гарманізацыі міжнацыянальна-культурных арыентацый неабходна і адпаведная карэкціроўка мэт выхавання.

## Будаўніцтва ва ўласным доме

Асаблівай увагі заслугоўваюць вывады і прапановы, якія ўтрымліваюцца ў адным з праектаў канцэпцыі нацыянальнай школы Беларусі. Аўтары ў якасці прынцыповых лічаць тры акалічнасці нацыянальна-культурнага выхавання:

«Па-першае, для мінімізацыі феномена "нацыянальнага эгаізму", зняцця псіхалагічнага комплексу "свае—чужыя" важна сфарміраваць у дзяцей прынцыпе агульначалавечых нормаў маралі, разуменне таго, што няма дрэнных народаў, што ўзаемнае ўзбагачэнне і дыялог значна прадукцыйнейшыя, чым узаемная ізаляцыя, што прыналежнасць да пэўнай нацыі не з'яўляецца найважнейшым чыннікам, які вызначае месца чалавека ў грамадстве.

Па-другое, агульначалавечае і нацыянальнае не павінны супрацьпастаўляцца; агульначалавечыя правы і каштоўнасці служаць рэгулятарамі, крытэрыямі ў справе ўзгаднення разнастайных праграм нацыянальна-культурнага будаўніцтва.

Па-трэцяе, у сувязі з тым, што сучасная форма нацыянальнай культуры Беларусі складаецца на нашых вачах, станаўляльнае значэнне набывае дзейнасць дзяцей і настаўнікаў, скіраваная не проста на аднаўленне, адраджэнне роднай культурнай традыцыі, а на будаўніцтва ўласнага нацыянальнага дома» *[8. С. 111]*.

І вельмі добра, што амаль усе гэтыя прынцыпы знайшлі адлюстраванне ў канцэпцыі выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, адобранай пастановай калегіі Міністэрства адукацыі *[9]*.

Важна таксама, што аксіялагічны падыход цалкам рэалізаваны пры распрацоўцы «Программы воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь», зацверджанай Міністэрствам адукацыі ў 2000 г. і заяўленай як «первый национальный документ, задающий ориентиры практике воспитания в новом тысячелетии» *[10]*. Больш таго, калектыву аўтараў пад кіраўніцтвам Л. Н. Ціханава, І. І. Цыркуна і М. І. Латыша ўдалося спецыяльна вылучыць асноўныя культурныя каштоўнасці па ўсіх напрамках выхавання ў якасці арыенціраў для практычных работнікаў. Пры гэтым, трэба адзначаць, многія сааўтары дадзенай праграмы прытрымліваліся культурнага кансерватызму як аднаго з варыянтаў

аксіялагічнага падыходу. Кансерватыўнага ў тым сэнсе, што школа не павінна ўзначальваць пераўтваральныя рухі, яе справа — адстойваць ясныя, вызначаныя стабільныя назапашванні педагогікі і чалавецтва ў цэлым. Менавіта таму традыцыйныя каштоўнасці ў праграме пераважаюць над інавацыйнымі і амаль адсутнічаюць ліберальна-дэмакратычныя, у тым ліку рынкавыя. Між тым рысы лібералізму (уменне і жаданне карыстацца сваімі правамі, свабода выбару ва ўмовах адноснага аксіялагічнага плюралізму, імкненне да поспеху, прадпрымальнасць, канкурэнтаздольнасць і гэтак далей) хоць і ў меншай ступені, але павінны прысутнічаць і ў нас. І гэта закладзена ў аснову афіцыйнай ідэалогіі, што фарміруецца, сучаснай беларускай дзяржавы. «Думаю, ничего плохого нет в жесткой конкуренции. Все равно мир в этом развивается, конкуренция порождает высочайшие образцы творчества и результатов труда»,— заяўляе кіраўнік нашай дзяржавы *[1]*.

Неабходнасць больш поўнага ўліку ў выхаваўчай рабоце пазітыўных інавацый дыктуецца і змяненнем духоўна-маральнага свету сучаснай моладзі. Як паказваюць вынікі сацыялагічных даследаванняў, праведзеных сярод розных катэгорый навучэнскай моладзі нашай рэспублікі, «в последнее время принижены идейно-нравственные установки личности, уменьшился эмоционально-нравственный максимализм, связанный с неприятием антисоциальных проявлений в общественной жизни, притупились коллективистские начала и принципы общежития, обострились проблемы общечеловеческих духовно-нравственных ценностей. Возросла потребность личности в признании ее достоинства, прав и свобод, в том числе права на собственный выбор жизненного пути, самореализацию, самосовершенствование; терпимость к инакомыслящим и ведущим рискованный образ жизни стала нормой; знания, направленные на повышение профессионализма и деловых качеств индивида, стали восприниматься как выгодный капитал» *[11. С. 37—38]*.

## Ёсць прапановы!

Такім чынам, сацыяльная трансфармацыя і чаканні грамадства, а таксама рэальныя працэсы сацыялізацыі моладзі ў нашай краіне патрабуюць сучасных падыходаў да мэт і задач выхавання. Думаецца, што адным з крокаў на гэтым шляху магло б стаць удакладненне структуры мэтамеркавання ў дзяржаўнай канцэпцыі выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі.

**I.** Ідэалам выхавання, безумоўна, можна вызначыць усебакова і гарманічна развітую асобу ў новым яе разуменні. Разумнасць арыентацыі на такі ідэал пацвярджаецца і сусветнай інавацыйнай практыкай у галіне адукацыі. Напрыклад, вальдорфская педагогіка, якая стала прыкметным рухам у Германіі, Швейцарыі, Швецыі, Даніі, Фінляндыі, Галандыі, Аўстрыі, Англіі і ЗША, сцвярджае наступнае: «Школа не должна ставить перед собой иных задач, кроме наиболее полного раскрытия заложенных в человеке задатков». Вядучым паняццем такога педагагічнага працэсу і арыентацыі работы школы лічацца паняцці «целостности», «намерение дать образование всему человеку, его мышлению, чувству, воле или, иными словами, его голове, сердцу и рукам» *[12. С. 155]*. Тая ж ідэя закладзена і ў канвенцыі ААН аб правах дзіцяці. У гэтым гуманістычным дакуменце, падпісаным нашай дзяржавай у 1990 годзе, абвяшчаецца: дзяржавы-ўдзельніцы пагаджаюцца ў тым, што адукацыя павінна быць накіравана на развіццё асобы, талентаў, разумовых і фізічных здольнасцей «в их самом полном объеме» *[13, артыкул 29]*.

**II.** Мэта выхавання, вызначаная ў канцэпцыі як «формирование социально, духовно и морально зрелой творческой личности, субъекта своей жизнедеятельности», з'яўляецца няпоўнай. Напрыклад, тут не закранута пытанне пра фізічнае ўдасканаленне. А між тым, на самым высокім дзяржаўным узроўні падкрэс-

ліваецца: «Жизнь и здоровье наших людей должны стать приоритетными ценностями в общественном сознании, в стратегии и тактике государственной социально-экономической политики» *[1]*.

Як пісаў А. С. Макаранка: «Попытки воплотить выражение цели воспитания в короткой формуле доказывают только полный отрыв от всякой практики, от всякого дела» *[14. С. 169]*. Мэта, сапраўды, павінна быць разгорнутай, зразумелай, канкрэтнай і тэхналагічнай. Хутчэй за ўсё, нават не адна, а некалькі. Галоўнае, каб мэты не супярэчылі, а ўзаемна дапаўнялі адна адну і найбольш поўна раскрывалі ідэал выхавання. На гэтую ролю падыходзяць арыенціры, сфармуляваныя ў канцэпцыі пад выглядам задач «нравственного развития личности, формирования патриотизма и гражданственности, трудовых и жизненных навыков, здорового образа жизни» і гэтак далей.

**III.** Урэшце, самай пільнай увагі заслугоўвае раздзел «Содержание воспитания» разгляданай канцэпцыі, прысвечаны фарміраванню маральна-этычнай, нацыянальнай, грамадзянскай, псіхалагічнай, гендэрнай, эстэтычнай, экалагічнай і другіх відаў культуры асобы. Зразумела, што перад рознымі грамадскімі, дзяржаўнымі, групавымі і індывідуальнымі суб'ектамі выхавання могуць стаяць спецыфічныя задачы. ■

## ЛІТАРАТУРА


1. Лукашенко А. Г. Сильная и процветающая Беларусь должна иметь прочный идеологический фундамент // Настаўніцкая газета. 28 марта 2003 года.
2. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі). Мн., 2002.
3. Новейший философский словарь: 2-е изд., перераб. и дополн. Мн.: Интерпрессервис; Книжный дом, 2001.
4. Гусинский Э. Н., Турчанинова Ю. И. Введение в философию образования. М.: Логос, 2001.
5. Грымаць А. Л. Фарміраванне маральных ідэалаў школьнікаў: Манаграфія. Мн.: Геомант, 2000.
6. Давыдов А. П. Социокультурные основания модернизации религиозного сознания // Мир психологии. 2003. № 2.
7. Гершунский Б. С. Менталитет и образование. М.: Институт практической психологии, 1996.
8. Канцэпцыя нацыянальнай школы Беларусі: Праект // Адукацыя і выхаванне. 1995. № 10.
9. Концепция воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь // Настаўніцкая газета. 2000. 22 лютага.
10. Программа воспитания детей и учащейся молодежи в Республике Беларусь // Праблемы выхавання. 2001. № 4.
11. Лаптенок С. Д. Духовно-нравственный мир учащейся молодежи. Мн.: Амалфея, 2001.
12. Загвоздкин В. К. О вальдорфской педагогике и ее критиках // Человек. 1998. № 1.
13. Конвенция ООН о правах ребенка // Настаўніцкая газета. 1999. 8 красавіка.
14. Макаренко А. С. Педагогические сочинения: В 8-ми т. Т. 1. М.: Педагогика, 1983.